# Псіхалагічныя веды — педагогу

Асноўнай мэтай сучаснай школы з'яўляецца фарміраванне рознабакова развітай сацыяльна актыўнай асобы, яркай творчай індывідуальнасці. Рэалізацыя гэтай мэты, ажыццяўленне на практыцы прынцыпаў дэмакратызацыі і гуманізацыі сістэмы адукацыі патрабуе ад педагогаў якасна новых ведаў аб асобе вучня, школьным калектыве. Правядзенне школьнай рэформы немагчыма без укаранення ў практыку работы школ дасягненняў псіхолага-педагагічнай навукі. У настаўнікаў, школьных псіхолагаў, класных кіраўнікоў — усіх, хто цікавіцца пытаннямі псіхалогіі выхавання і навучання, развіцця здольнасцей і адоранасці вучняў, псіхалагічнай дыягностыкі і карэкцыі, працы школьнага псіхолага, — штодзённа ўзнікае патрэба ў рознага тыпу даведніках, у тым ліку і бібліяграфічных, якія дапамогуць знайсці літаратуру па вышэйпералічанай праблематыцы.

Штомесячны бюлетэнь "Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку", які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з 1960 г., змясціў у сёмым нумары за 2000 год бібліяграфічны спіс "Псіхалагічныя веды — педагогу", падрыхтаваны Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкай Беларусі (складальнікі А.Дз.Кухарава і Л.Б.Яхімовіч). Спіс не прэтэндуе на ўсеахопленасць тэмы і ўключае беларускія і расійскія выданні за апошнія пяць гадоў, якія будуць карыснымі для педагогаў. Літаратура ў ім сістэматызавана па асноўных тэматычных раздзелах, унутры раздзелаў — у лагічнай паслядоўнасці.

Анатаваны спіс складаецца з наступных раздзелаў: "Псіхалагічная служба ў школе"; "Псіхалогія педагагічнай дзейнасці"; "Развіццё і фарміраванне асобы вучня"; "Псіхалогія выхавання дзяцей школьнага ўзросту"; "Псіхалагічны аналіз вучэбнай дзейнасці"; "Здольнасці вучня. Адоранасць"; "Псіхалогія ўзаемаадносін вучняў з настаўнікамі"; "Канфлікты настаўнікаў з вучнямі". Матэрыялы, прадстаўленыя ў гэтых раздзелах, акажуць дапамогу настаўнікам-практыкам у іх працы і паглыбленні ведаў па вышэйназваных тэмах.

***К.Дз.Варанько,***
**галоўны бібліёграф**
**Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**